# Весці БДПУ

**Штоквартальны навукова-метадычны часопіс.**
**Выдаецца з чэрвеня 1994 г.**

**№ 2 (48) 2006**

**СЕРЫЯ 2.**
**Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія**


## Змест


***Галоўны рэдактар:***
**П. Дз. Кухарчык**

***Рэдакцыйная калегія:***
Н. Г. Алоўнікава
А. І. Андарала
(*нам. галоўнага рэдактара*)
В. А. Бондар
М. К. Буза
В. В. Бушчык
(*нам. галоўнага рэдактара*)
Ю. А. Быкадораў
(*нам. галоўнага рэдактара*)
А. М. Вітчанка
С. Я. Гайдукевіч
К. У. Гаўрылавец
А. А. Гіруцкі
В. М. Дабранскі
Л. М. Давыдзенка
А. В. Данільчанка
М. М. Забаўскі
В. Б. Кадацкі
Я. Л. Каламінскі
У. М. Калюноў
Л. В. Камлюк
Л. А. Кандыбовіч
І. В. Катляроў
П. В. Кікель
Г. А. Космач
У. М. Котаў
Н. І. Кунгурава
І. Я. Левяш
М. І. Лістапад
А. М. Люты
У. А. Мельнік
І. А. Новік
В. М. Русак
А. І. Смолік
В. Дз. Старычонак
В. Б. Таранчук
І. С. Ташлыкоў
В. М. Фамін
А. Т. Федарук
А. С. Цернавы
Л. Н. Ціханаў
І. І. Цыркун
М. Г. Ясавееў



***Гісторыя***

*Бушчык Г. П.* Выкарыстанне германскіх рэпарацый для аднаўлення Мінска пасля Вялікай Айчыннай вайны ..... 3

*Столяр Дз. М.* Асноўныя кірункі дзейнасці асобых аддзелаў партызанскіх фарміраванняў Баранавіцкай вобласці ..... 7

*Вялікі А. Ф.* Этнапалітычны характар прызыву ў Чырвоную Армію і Войска Польскае ў заходніх абласцях Беларусі ў 1944—1945 гг. ..... 10

*Вінніца Г. Р.* Халакост у Слуцкім раёне ..... 13

*Каспяровіч А. М.* Грамадска-палітычнае жыццё тэхнікумаў Савецкай Беларусі ў 20-х гг. XX ст. ..... 18

*Пілецкі В. А.* Непазнанае ў змесце выхаваўча-адукацыйнага працэсу раннесярэднявечнага насельніцтва Беларусі ..... 24

*Груца І. А.* Пачатак працэсу дэмаралізацыі Вялікай арміі і яго ўплыў на лёс маскоўскіх трафеяў (на этапе адступлення ад Масквы да мяжы з Беларуссю) ..... 29

*Пракаповіч Л. Э.* Уплыў фабрычна-заводскай прамысловасці на сацыяльныя працэсы ў Беларусі ў XIX ст. ..... 33

*Пуцік У. С.* Аграрна-сялянскія пытанні ў праграмах і дзейнасці партый і грамадскіх рухаў ліберальнага кірунку ў Беларусі (пачатак XX ст.) ..... 36

*Трубчык П. А.* Нацыянальнае пытанне ў праграмах і дзейнасці сацыял-дэмакратычных партый у Беларусі ў перыяд рэвалюцыі 1905—1907 гг. ..... 43

*Якаўчук В. І.* Супрацьпажарная абарона беларускай вёскі ў першыя гады савецкай улады (1924—1930 гг.) ..... 47

*Варывончык І. В.* Амерыканскі сярэдні клас і праблемы адукацыі ў канцы XX — пачатку XXI ст. ..... 49

***Філасофія***

*Кікель П. В., Абалевіч І. В.* Матэматызацыя навукі і неабходнасць рэарганізацыі сістэмы адукацыі ..... 55

*Бліхарж Р. І., Вержыбок Г. У.* Дамінанты метадалагічнай рэфлексіі ў навукова-даследчай дзейнасці ..... 58

*Кузняцоў А. У.* Сацыяльная філасофія ў сістэме сучасных філасофскіх ведаў ..... 64

*Кузняцоў А. У., Кузняцоў В. У.* Фарміраванне тэацэнтрычнай парадыгмы сацыяльных ведаў ..... 69

***Паліталогія***

*Грынёва В. М.* Палітыка нейтралітэту і забеспячэнне калектыўнай бяспекі ..... 76


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

УДК 338.45

*Л. М. Давыдзенка, Т. Д. Давыдзенка*

# РАЗВІЦЦЁ СФЕРЫ ІНТЭЛЕКТУАЛЬНЫХ ПАСЛУГ КІРАВАННЯ ВЫТВОРЧАСЦЮ

Аналізуючы сучасны стан кіравання прадпрыемствамі, трэба адзначыць, што ў свеце існуюць наступныя канцэпцыі:

- канцэпцыя MRP — кіраванне ўсімі матэрыяльнымі рэсурсамі вытворчасці;
- канцэпцыя ERP — кіраванне ўсімі рэсурсамі карпаратыўных прадпрыемстваў з адзінай базай даных;
- канцэпцыя SCM — кіраванне знешнімі ў адносінах да прадпрыемства элементамі бізнес-ланцужка;
- канцэпцыя ERP для дробных і сярэдніх прадпрыемстваў.

Магутныя інтэлектуальныя прадукты Расіі і Беларусі на рынку праграмных сродкаў стандарту MRP, ERP, SCM — сістэма кіравання карпарацыяй «Галактыка» і сістэма прыняцця бізнес-рашэнняў «1С:Прадпрыемства», сістэмы кіравання электронным дакументаабаротам «Справа» і «Рэкорд», а таксама даведачныя прававыя сістэмы «КансультантПлюс» і «Эталон».

Кіраванне карпаратыўным зместам неструктураваных дакументаў, ад чарцяжоў і карт тэхналагічных працэсаў да маркетынгавых матэрыялаў і прэзентацый, відэа- і аўдыёдакументаў, электронных пісем, здзяйсняецца з дапамогай платформы дадаткаў «Documentum».

Апошняя версія сістэмы «Галактыка» рэалізавала канцэпцыю MRP-II: планаванне масавай, серыйнай, адзінкавай вытворчасцей вырабу на заказ, планаванне збыту, забеспячэнне, планаванне доўгатэрміновае і аператыўнае, назіранне за станам кожнага матэрыялу і інш.

Канцэпцыя ERP заключаецца ў інтэграванні ўсіх падраздзяленняў і функцый карпарацыі ў адзіную інфармацыйную сістэму. Канцэпцыя ERP ахоплівае ўсе бакі вытворчай і камерцыйнай дзейнасці прадпрыемства. Адзіная база даных даступна самым розным службам. На прадпрыемствах, дзе ўкараняецца ERP-сістэма, адсутнічае праблема стыкоўкі інфармацыі.

Для эфектыўнасці рэзультатаў пры стварэнні АСКВ мэтазгодна разглядаць паняцці «контураў», а таксама «модуляў». Яны ствараюць мадэлі пластоў з пункту гледжання патрэб у адпаведных АСКВ, тэхнічных магчымасцях, эканамічнай эфектыўнасці.

Канцэпцыя SCM рэалізуецца модулямі «Кіраванне маркетынгам» сістэмы «Галактыка» і «1С:Прадпрыемства»: увядзенне расшыранай інфармацыі аб таварах і паслугах, апрацоўка кантактаў з патэнцыяльнымі пастаўшчыкамі, увядзенне дасье на фірмы-канкурэнты, тавары-аналагі, цэнавую палітыку; кіраванне збытам, кантроль жыццёвага цыкла тавараў, аналіз рынку рэкламных паслуг, маркетынг аналізу збыту.

Выбраныя сістэмы ERP для дробных і сярэдніх прадпрыемстваў на рынку краін СНД прадстаўлены фірмамі, праграмнымі прадуктамі і іх функцыямі аўтаматызацыі (табл.).

*Табліца*

| | | |
|---|---|---|
| Галактыка | Галактыка | *Лагістыка, бухгалтэрыя* |
| Электронныя офісныя сістэмы | Справа — Прадпрыемства | *Электронны дакументаабарот* |
| 1С | 1С:Прадпрыемства | *Лагістыка, бухгалтэрыя, гандаль* |

На сучасным этапе развіцця прамысловасці неабходнасць комплекснай аўтаматызацыі вытворчых працэсаў у рамках стварэння АСКВ абумоўлена шэрагам тэхніка-эканамічных прычын і перадумоў:

1. Бесперапыннае ўзрастанне складанасці функцый і задач кіравання вытворча-гаспадарчай дзейнасцю прадпрыемства за кошт устанаўлення вялікай колькасці ўзаемасувязей паміж асобнымі супрацоўнікамі, падраздзяленнямі прадпрыемства і з пастаўшчыкамі. Пры гэтым рост сувязей адбываецца значна хутчэй, чым колькасць вытворчых і тэхніка-эканамічных аб'ектаў кіравання, яны павялічваюцца прапарцыянальна квадрату гэтай колькасці аб'ектаў.

2. Рэзкае павелічэнне хуткасці накаплення даных, узрастанне патокаў тэхналагічнай і вытворча-эканамічнай інфармацыі, якую неабход-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

на сабраць і перапрацаваць для прыняцця рашэнняў па аператыўным кіраванні вытворчасцю.

3. Павелічэнне тэмпаў наменклатуры і аб'ёмаў вытворчасці, выклікаючае неабходнасць скарачэння тэрмінаў асваення новай тэхнікі і часу на падрыхтоўку вытворчасці, уніфікацыі і тыпізацыі элементна-канструктыўнай базы выпускаемай прадукцыі.

4. Павышэнне тэмпаў маральнага старэння прадуктаў у спалучэнні з патрабаваннямі высокай дынамічнасці развіцця, што выклікае неабходнасць усямернага скарачэння цыкла «распрацоўка — вытворчасць — укараненне» шляхам рацыянальнай арганізацыі і паскарэння асваення новай тэхнікі.

5. Узмацняючаяся індывідуалізацыя запытаў спажыўцоў на таварную прадукцыю, своечасовае задавальненне якіх магчыма толькі пры высокай гібкасці вытворчасці, дасягаемай за кошт аўтаматызацыі ўсіх функцый кіравання жыццёвым цыклам выпускаемых вырабаў.

6. Узмацненне жорсткасці патрабаванняў да якасці, у першую чаргу да надзейнасці выпускаемай прадукцыі, задаволіць якія можна толькі з дапамогай праграмна-кіруемага абсталявання з аўтаматычным кантролем і кіраваннем тэхналагічнымі працэсамі на ўсіх фазах жыццёвага цыкла выпускаемых вырабаў.

7. Няўхільны рост да патрэбы ў навукаёмістай прадукцыі, таварны выпуск якой магчымы толькі пры высокім узроўні аўтаматызацыі вытворчых працэсаў.

Асноўнымі перадумовамі, стымулюючымі стварэнне АСКВ, выступаюць:

1. Павышэнне навукова-тэхнічнага ўзроўню тэхналагічных працэсаў вырабу складанай таварнай прадукцыі, заснаваных на найноўшых дасягненнях мікра- і оптаэлектронікі, нелінейнай оптыкі, лазернай тэхнікі, мікрамеханікі і інш.

2. Удасканаленне машыннага парка, з'яўленне новых высокапрадукцыйных машын, механізмаў і абсталявання, уключаючых станкі з ЧПУ, аўтаматызаваныя універсальныя шматмэтавыя станкі, камп'ютэрныя прамысловыя маніпулятары і робаты, прымяняемыя ў гібкіх вытворчых сістэмах (ГВС).

3. Павелічэнне надзейнасці тэхналагічнага абсталявання за кошт выкарыстання новых канструкцыйных матэрыялаў, убудаваных мікрапрацэсарных прыбораў кантролю і дыягностыкі, якія забяспечваюць здзяйсненне апярэджваючых прафілактычных рамонтаў і бесперабойную працу машыннага парка на працягу ўсяго тэрміну старэння.

4. Шырокае распаўсюджанне развітых персанальных ЭВМ (ПЭВМ), якімі можна аснашчаць практычна ўсе працоўныя месцы і рэалізаваць дружалюбны да чалавека інтэлектуальны інтэрфейс у сістэме кіравання ці лакальнай вылічальнай сеткі са стандартнымі архітэктурамі і пратаколамі.

5. З'яўленне інтэлектуальных праграміруемых кантралёраў з адносна невысокімі адносінамі кошт/функцыя, параўнальна недарагіх суперкамп'ютэраў, дазваляючых ствараць эканамічна мэтазгодныя сістэмы і рабочыя станцыі для кіравання, валодаючыя малымі габарытамі і высокай надзейнасцю.

6. Комплексная аўтаматызацыя вытворчых працэсаў і суправаджаючых іх кіраўніцкіх функцый набывае выключна важную ролю ў пастаянна ўскладняючыхся ўмовах функцыянірання прамысловага прадпрыемства, абмежаванасці працоўных, матэрыяльных, энергетычных рэсурсаў і вострай неабходнасці ўсёй эканоміі.

Асноўнай праблемай стварэння АСК з'яўляецца атрыманне высокай эфектыўнасці ад распрацоўваемай сістэмы. Неабходна надаваць асаблівую ўвагу ўдасканаленню арганізацыйнай структуры кіравання прадпрыемствам, рацыянальнаму выкарыстанню вылічальных рэсурсаў, павелічэнню долі вырашаемых аптымізацыйных задач, інтэгральнай аўтаматызацыі вытворчасці на ўсіх узроўнях кіравання, уніфікацыі і тыпізацыі праектных рашэнняў, аўтаматызацыі праектавання АСК.

Адначасова з шырокім развіццём АСК узнік востры недахоп кадраў у гэтай галіне. Для распрацоўкі АСК неабходна добра ведаць эканоміка-матэматычныя метады кіравання, добра ўяўляць арганізацыю вытворчасці, ведаць асновы тэорыі аўтаматызаванага кіравання вытворчасцю, інфарматыку, умець праектаваць сістэмы на базе сучасных сродкаў аўтаматызацыі праектавання. Трэба было звярнуць асаблівую ўвагу на інтэграванасць сістэмы, на аўтаматызацыю ўсіх функцый сістэмы ад тэхналагічнага працэсу да арганізацыйнага кіравання і ў далейшым развіваць аўтаматызаваныя сістэмы кіравання тэхналагічнымі працэсамі (АСК ТП). Першыя АСК ТП былі ўведзены ў 70-х гг. XX ст. Найбольшая колькасць такіх сістэм была ўкаранена ў хімічнай і нафтахімічнай прамысловасці, у чорнай і каляровай металургіі, у энергетыцы, што паказала іх высокую эфектыўнасць. Тэрмін акупнасці ў сярэднім склаў 1—2 гады. Створаныя АСК ТП па сваім характары былі аўтаматызаванымі сістэмамі: у іх значная роля адводзілася аператару, які па інфармацыі, прадастаўленай ЭВМ, прымаў рашэнні сам або рэалізоўваў рашэнні, падказаныя ЭВМ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

быту і адпачынку, павышэнне сацыяльнай актыўнасці кожнага работніка.

8. Выкананне прадпрыемствам норм і патрабаванняў да ўздзеяння працэсаў вытворчасці і выпускаемай прадукцыі на навакольнае асяроддзе, рацыянальнае выкарыстанне прыродных рэсурсаў, іх аднаўленне і ўзнаўленне.

Для ацэнкі дасягнення пастаўленай мэты і рашэння фенаменалагічных задач пры стварэнні АСКВ неабходна выбраць ці распрацаваць крытэрый, пад якім разумеецца асноўная прыкмета сістэмы, дазваляючая колькасна ацаніць якасць яе працы, эфектыўнасць выканання функцый. Крытэрый павінен выцякаць з глабальнай мэтавай функцыі (дактрыны) АСКВ. Пры рашэнні задач аптымізацыі вытворчых працэсаў найбольшае распаўсюджанне атрымалі эканамічныя і тэхніка-эканамічныя функцыі.

Сукупнасць паказчыкаў павінна забяспечыць адзінства, комплекснасць, узаемасувязь, узаемаабумоўленасць і сувымернасць асобных паказчыкаў; верагоднасць, дакладнасць і паўнату ўліку лакальных паказчыкаў; дынамічнасць, магчымасць выяўлення і ацэнкі ўплыву розных фактараў на аб'ект кіравання.

У адпаведнасці з мэтай і задачамі, пастаўленымі перад АСКВ, у рамках прынятага крытэрыю, тэхнічнымі, эканамічнымі і тэхніка-эканамічнымі паказчыкамі могуць быць:

— выкарыстанне мадэлей тыпавых праектных рашэнняў (ТПР);
— максімізацыя ўзроўню рэнтабельнасці і сумарнага прыбытку прадпрыемства, загрузкі абсталявання, рытмічнасці яго працы, тэхнічнай узброенасці працы; аб'ёму і наменклатуры, якасці і канкурэнтаздольнасці выпускаемай прадукцыі; выкарыстання вытворчых і матэрыяльных рэсурсаў; удасканалення вытворчых працэсаў, працы кіраўніцкага і абслугоўваючага персаналу; аператыўнасці атрымання інфармацыі і прыняцця рашэнняў; устойлівасці і надзейнасці функцыяніравання прадпрыемства;
— мінімізацыя ўнутрызменных прастояў абсталявання і працягласці вытворчага цыкла выпуску таварнай прадукцыі; тэрміну акупнасці аднаразовых укладанняў на стварэнне АСКВ і зніжэнне сабекошту вырабляемых тавараў; часу прыняцця кіраўніцкіх рашэнняў і канкрэтызацыі дагаворнага тэрміну пастаўкі прадукцыі.

Эфектыўнасць модуля вызначаецца формулай:

Эфмод. = ЭФтпр — ЭФсоб., дзе:

Эфмод. — эфектыўнасць модуля;

ЭФтпр — эфектыўнасць модуля, рэалізаванага з дапамогай метаду тыпавых праектных рашэнняў;

Эфулас. — эфектыўнасць аперацый модуля, рэалізаваных уласнымі сіламі.

Эфектыўнасць сістэмы, рэалізаванай з дапамогай метаду тыпавых праектных рашэнняў, вызначаецца па формуле:

ЭФк = F(Nk, T, RC, [c1, c2, … cn], [f1, f2, … fn], Ck, Ths, Os), дзе:

Nk — нумары контураў; T — перыяд даследавання і праектавання;

RC — рыначная цана; [c1, c2, … cn] — вектар эфектыўнасці модуляў;

[f1, f2, … fn] — вектар фінансавай эфектыўнасці модуляў;

Ck — цана ўкаранення контуру;

Ths — тэхнічныя характарыстыкі абсталявання;

Os — тып сервера.

Такім чынам, інфармацыйныя паслугі ў сістэме кіравання за палову стагоддзя свайго існавання зведалі значныя змяненні: ад праграм, здольных выконваць толькі самыя простыя лагічныя і арыфметычныя аперацыі, да складаных сістэм кіравання прадпрыемствамі. Сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі выступаюць магутным інтэлектуальным інструментам павышэння эфектыўнасці кіравання вытворчасцю.

*Літаратура*


1. Комплексная система автоматизации управления предприятием «Галактика». М., 2005.
2. Комплексная система автоматизации документооборота «Дело». Мн., 2004.
3. *Давыденко Т. Д., Молчина Л. И., Кривошея Т. А., Юшкевич М. Н.* Делопроизводство и деловая корреспонденция : учеб.-метод. комплекс. Мн., 2004.
4. *Давыденко Л. Н., Давыденко Т. Д.* Интеллектуализация учебного процесса по управлению занятиями // Образование для устойчивого развития: на пути к обществу знания : материалы Междунар. форума ЮНЕСКО. Мн., 2005.
5. *Давыденко Л. Н., Давыденко Т. Д.* Интеллектуализация учебного процесса в подготовке менеджеров // Высшая школа: проблемы и перспективы : материалы 7-й Междунар. науч.-метод. конф. Мн., 2005.



*Summary*

*The analysis of comtemporary state of enterprises managememt is given in the article. Differeent conceptions of material and intellectual resources management of small and secondary enterprises are described.*


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

быту і адпачынку, павышэнне сацыяльнай актыўнасці кожнага работніка.

8. Выкананне прадпрыемствам норм і патрабаванняў да ўздзеяння працэсаў вытворчасці і выпускаемай прадукцыі на навакольнае асяроддзе, рацыянальнае выкарыстанне прыродных рэсурсаў, іх аднаўленне і ўзнаўленне.

Для ацэнкі дасягнення пастаўленай мэты і рашэння фенаменалагічных задач пры стварэнні АСКВ неабходна выбраць ці распрацаваць крытэрый, пад якім разумеецца асноўная прыкмета сістэмы, дазваляючая колькасна ацаніць якасць яе працы, эфектыўнасць выканання функцый. Крытэрый павінен выцякаць з глабальнай мэтавай функцыі (дактрыны) АСКВ. Пры рашэнні задач аптымізацыі вытворчых працэсаў найбольшае распаўсюджанне атрымалі эканамічныя і тэхніка-эканамічныя функцыі.

Сукупнасць паказчыкаў павінна забяспечыць адзінства, комплекснасць, узаемасувязь, узаемаабумоўленасць і сувымернасць асобных паказчыкаў; верагоднасць, дакладнасць і паўнату ўліку лакальных паказчыкаў; дынамічнасць, магчымасць выяўлення і ацэнкі ўплыву розных фактараў на аб'ект кіравання.

У адпаведнасці з мэтай і задачамі, пастаўленымі перад АСКВ, у рамках прынятага крытэрыю, тэхнічнымі, эканамічнымі і тэхніка-эканамічнымі паказчыкамі могуць быць:

— выкарыстанне мадэлей тыпавых праектных рашэнняў (ТПР);
— максімізацыя ўзроўню рэнтабельнасці і сумарнага прыбытку прадпрыемства, загрузкі абсталявання, рытмічнасці яго працы, тэхнічнай узброенасці працы; аб'ёму і наменклатуры, якасці і канкурэнтаздольнасці выпускаемай прадукцыі; выкарыстання вытворчых і матэрыяльных рэсурсаў; удасканалення вытворчых працэсаў, працы кіраўніцкага і абслугоўваючага персаналу; аператыўнасці атрымання інфармацыі і прыняцця рашэнняў; устойлівасці і надзейнасці функцыяніравання прадпрыемства;
— мінімізацыя ўнутрызменных прастояў абсталявання і працягласці вытворчага цыкла выпуску таварнай прадукцыі; тэрміну акупнасці аднаразовых укладанняў на стварэнне АСКВ і зніжэнне сабекошту вырабляемых тавараў; часу прыняцця кіраўніцкіх рашэнняў і канкрэтызацыі дагаворнага тэрміну пастаўкі прадукцыі.

Эфектыўнасць модуля вызначаецца формулай:

Эфмод. = ЭФтпр — ЭФсоб., дзе:

Эфмод. — эфектыўнасць модуля;

ЭФтпр — эфектыўнасць модуля, рэалізаванага з дапамогай метаду тыпавых праектных рашэнняў;

ЭФулас. — эфектыўнасць аперацый модуля, рэалізаваных уласнымі сіламі.

Эфектыўнасць сістэмы, рэалізаванай з дапамогай метаду тыпавых праектных рашэнняў, вызначаецца па формуле:

ЭФк = F(Nk, T, RC, [c1, c2, … cn], [f1, f2, … fn], Ck, Ths, Os), дзе:

Nk — нумары контураў; T — перыяд даследавання і праектавання;

RC — рынкавая цана; [c1, c2, … cn] — вектар эфектыўнасці модуляў;

[f1, f2, … fn] — вектар фінансавай эфектыўнасці модуляў;

Ck — цана ўкаранення контуру;

Ths — тэхнічныя характарыстыкі абсталявання;

Os — тып сервера.

Такім чынам, інфармацыйныя паслугі ў сістэме кіравання за палову стагоддзя свайго існавання зведалі значныя змяненні: ад праграм, здольных выконваць толькі самыя простыя лагічныя і арыфметычныя аперацыі, да складаных сістэм кіравання прадпрыемствамі. Сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі выступаюць магутным інтэлектуальным інструментам павышэння эфектыўнасці кіравання вытворчасцю.

*Літаратура*


1. Комплексная система автоматизации управления предприятием «Галактика». М., 2005.
2. Комплексная система автоматизации документооборота «Дело». Мн., 2004.
3. *Давыденко Т. Д., Молчина Л. И., Кривошея Т. А., Юшкевич М. Н.* Делопроизводство и деловая корреспонденция : учеб.-метод. комплекс. Мн., 2004.
4. *Давыденко Л. Н., Давыденко Т. Д.* Интеллектуализация учебного процесса по управлению занятиями // Образование для устойчивого развития: на пути к обществу знания : материалы Междунар. форума ЮНЕСКО. Мн., 2005.
5. *Давыденко Л. Н., Давыденко Т. Д.* Интеллектуализация учебного процесса в подготовке менеджеров // Высшая школа: проблемы и перспективы : материалы 7-й Междунар. науч.-метод. конф. Мн., 2005.



*Summary*

*The analysis of comtemporary state of enterprises managememt is given in the article. Differeent conceptions of material and intellectual resources management of small and secondary enterprises are described.*


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ